# СУЧАСНЫ АГУЛЬНЫ КРЫЗІС З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ ТЭАРЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРАЛОГІІ

**Мікалай Крукоўскі**[1]

**Abstract**

The issues of cyclic culture development are regarded in the article. The author proves the thesis by means of many examples from history of culture of different epochs. In particular, under the conditions of a post-industrial society, relations between modern people and artistic sphere are producing an increasingly tangible influence of sensitive mass culture. On the whole interaction between global cycles and human values is one of topical issues in many different sciences, not only in culturology. Economic cycle refers to the periodic fluctuations of economic activity about its long term growth trend. The cycle involves shifts over time between periods of relatively rapid growth of output (recovery and prosperity), alternating with periods of relative stagnation or decline (contraction or recession). There are enough similarities between economic and social-cultural cycles. So the global financial crisis is just a part of general socio-cultural crisis. A key question is whether there are similar mechanisms that generate recessions and booms that exist in modern civilization so that the dynamics that appears as a cycle will be seen again and again.

**Keywords:** culture, cyclicity, crisis, civilization, style, values.

Няма больш практычнай рэчы, чым добрая тэорыя, гаворыць старадаўняя філасофская прымаўка, маючы на ўвазе заўсёдную неабходнасць адзінства тэорыі з практыкай. Але на першы погляд можа здацца, што загаловак нашага артыкула пакутуе на вострую лагічную супярэчлівасць, бо імкнецца аб'яднаць у сабе вельмі ўжо далёкія між сабой праблемы сённяшняга жыцця. Тое, што разумеецца звычайна пад словамі «сучасны агульны крызіс», мае сёння настолькі канкрэтныя асаблівасці, што востра зачапляе чалавека, нават увогуле не звязанага з навукай (напрыклад, абвальны рост цэнаў, распад сексуальнай маралі, павелічэнне злачыннасці, нарастанне карупцыі ў кіруючых органах, знекшталцэнне эстэтычнага густу, разлажэнне сучаснага мастацтва, распад сям'і і г. д.). Тэарэтычная ж культуралогія і сёння яшчэ некаторымі маскоўскімі спецыялістамі-культуролагамі з-за сваёй, як яны сцвярджаюць, абстрактнасці і схематычнасці, не ўхваляецца, хоць азначаная агульнасць крызісу якраз і

[1] Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі – прафесар, доктар філасофскіх і кандыдат філалагічных навук, член-карэспандэнт Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі.

прадугледжвае неабходнасць менавіта тэарэтычнага, а, значыць, у пэўнай меры і абстрактнага падыходу да гэтай праблемы. Нават Карл Маркс, прыхільнік вядомага тэзіса аб практыцы як крытэрыі ісціны, пісаў некалі ў сваім *Капітале*, што ў палітэканоміі як навуцы грамадскай галоўным інструментам даследавання з’яўляецца не мікраскоп і хімічныя рэактывы, а абстрактнае мысленне.[2] І Маркс тут не памыляўся – амаль тое ж самае адносна даўно ўжо сцвярджае і агульная тэорыя сістэм[3], якая законна прэтэндуе сёння на ролю асновы амаль што усёй навукі сучаснага, як яго некаторыя крыху паспешліва[4] называюць, інфармацыйнага грамадства.

## Падмуркі і перадумовы сучаснага агульнага крызісу

Сапраўды – тое, што маецца на ўвазе пад выразам «сучасны агульны крызіс», – заключае ў сабе настолькі шырокі і стракаты веер значэнняў, што нават слова «агульны» можа гучаць сумнеўна ў гэткім кантэксце. Што агульнага, здавалася б, можна бачыць, напрыклад, паміж сучасным сусветным фінансавым крызісам і постмадэрнісцкім крызісам у сучасным жывапісе? А тым не менш, такое агульнае павінна назірацца ў тым, і другім хоць бы ўжо таму, што і фінансы, і жывапіс як прадстаўнікі адпаведна эканомікі і мастацтва, належаць у якасці яе законных складнікаў да адзінай і дастаткова цэласнай, хоць і нашмат больш шырокай сістэмы, імя якой – культура. Менавіта таму паміж гэтымі фактарамі павінна назірацца пэўная ўзаемасувязь, ці, як гавораць матэматыкі, функцыянальная залежнасць або верагоднасная карэляцыя. І па той жа прычыне ў якасці даследчага інструмента тут павінна быць выкарыстана тэарэтычная культуралогія, логіка-катэгарыяльны апарат якой менавіта і прадвызначаецца для выяўлення такога тыпу шырокіх сістэмна-лагічных узаемасувязей. Таму пры выкарыстанні такога апарату трэба карыстацца, як пісаў Маркс, не мікраскопам ці хімічнымі рэактывамі, а сілай абстрактнага мыслення.

Тут невыпадкова прыйшлося запыніцца пры асвятленні гэтай асаблівасці праблемы з прычыны таго, што ў нашай сучаснай навуковай практыцы назіраецца хутчэй з’ява адваротнага тыпу. Гэта пэўнае звужэнне лагічнага дыяпазону азначанага даследчага інструментарыя ў выніку далейшай і часцей за ўсё залішняй канкрэтызацыі стасаваных у ім паняццяў, а ў саміх даследчыкаў – занадта вузкай іх асабістай спецыялізацыі. І ўсё гэта звычайна за кошт таго, што першым нам кідаецца ў вочы ў жыццёвай прак-

---

2 Маркс К. *Капитал.* Т. 1. М., 1988. С. 6.

3 Гл.: *Исследования по общей теории систем*. М., 1988. Сінергетыка, якая паспрабавала была ў наступныя гады яе замяніць, сёння, відавочна, пачынае ўключацца ў агульную тэорыю сістэм як яе частка, гл.: Князева Е.Н., Курдюмов С.П. *Основания синергетики.* СПб., 2002.

4 Паспешліва хоць бы таму, што сапраўднае інфармацыйнае грамадства як самая сучасная і самая прагрэсіўная, па меркаванню яго прыхільнікаў, грамадская форма не павінна была б перажываць такога ўсеагульнага крызісу, які мы назіраем сёння.

тыцы, так што ў выніку сапраўды ўзнікае рызыка за канкрэтнымі дрэвамі згубіць агульную карціну вывучанага лесу. Так, сённяшні эканамічны крызіс некаторымі з тых звышканкрэтных прагматыкаўэканамістаў разглядаецца толькі як крызіс фінансавы, у той час, як нават адукаванаму неспецыялісту зразумела, што гэта толькі частка агульнаэканамічнага, культурнага і нават сацыякультурнага крызісу. Яшчэ на пачатку XX стагоддзя Макс Вебер добра разумеў, што эканоміка, як і частка культуры агульнай, дастаткова выразна звязана з этыкай.[5] Блізка да гэтага з яго цікавасцю да ролі духу ў гаспадарчым жыцці падыходзіў і Вернер Зомбарт.[6] І гэта таксама, як убачым ніжэй, не выпадкова, бо такое скочванне да паўзучага эмпірызму і наогул да пасіўна-фактаграфічнага хаосу характэрна для сучаснай эпохі для ўсяе культуры як агульнай сацыякультурнай сістэмы на сённяшняй фазе яе развіцця. Тым жа тлумачыцца, дарэчы, і вышэйазначаная нелюбоў да абстрактнасці і «схематызму» логіка-тэарэтычнай методыкі, для якой быў нават прыдуманы постмадэрністамі выразна пежаратыўны тэрмін «логацэнтрызм».

Тая ж логіка-тэарэтычная методыка, ці, дакладней кажучы, тэарэтыка-сістэмны метад з яго сінхронна-структурным і дыяхронна-функцыянальным падыходамі як раз і дыктуюць нам неабходнасць такога спосабу разгляду і аналізу праблемы, калі разгляд ідзе, па-першае, ад агульнага і абстрактнага да асаблівага і канкрэтнага і, па-другое, ад структурнага разгляду ў лагічнай прасторы (сінхранія) да функцыянальнага разгляду ў лагічным часе (дыяхранія). Або, калі зноў спаслацца на справядлівага, дзякуючы Гегелю, Маркса, ад лагічнага да гістарычнага, хоць гэта некалькі і спрошчвае сутнасць праблемы.

Прытрымліваючыся гэтага падыходу, аналіз пытання пра паходжанне і сацыяльную прыроду сучаснага сусветнага крызісу і, у прыватнасці, крызісу эканамічнага, трэба распачынаць з самага агульнага азначэння культуры як цэласнай сістэмы духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам у працэсе яго гістарычнага развіцця, што садзейнічалі ягонаму дабрабыту і шчасцю.[7] І не трэба палохацца абстрактнасці і схематызму, якія могуць узнікнуць пры гэтым, бо і ў геаметрыі таксама назіраюцца такія ж абстрактнасць і схематызм. Але з дапамогай уласцівасцей геаметрыі мы толькі і можам разабрацца ў бясконцым хаатычнастракатым мностве форм самых разнастайных канкрэтных прадметаў і з'яў рэальнай рэчаіснасці, дзякуючы чаму не толькі пазнаюцца заканамернасці гэтага мноства, але і становіцца магчымым

---

[5] Вебер М. Протестантская этика и дух капитализма // Вебер М. *Избранные произведения.* М., 1900.

[6] Зомбарт В. *Буржуа.* М., 1994.

[7] Як бачыць чытач, у аснову тут кладзецца аксіялагічная канцэпцыя культуры савецкіх часоў, што захавала пэўную ісціннасць і да нашага часу з той толькі розніцай, што характэрная для таго перыяду арыентацыя на шчаслівую будучыню толькі ў камуністычным грамадстве заменена больш рэальнай і справядлівай арыентацыяй на чалавечае шчасце ўвогуле; гл.: Tatarkiewicz W. *O szczęnsciu.* Warszawa, 1962.

практычнае выкарыстанне заканамернасцей у тэхніцы. Больш таго, тут неабходна узяць глыбей, каб выявіць ў самім зыходным азначэнні культуры аснову такога раздзялення каштоўнасцей на духоўныя і матэрыяльныя, узгадаўшы, што і сам спажывец і творца культуры чалавек ўяўляе сабою, як пісаў яшчэ Арыстоцель, *zoon politikon* – жывёлу грамадскую, г. зн. пэўнае біясацыяльнае адзінства, што абумоўлівае сабой падзел чалавечых патрэб і задавальняльных іх каштоўнасцей на матэрыяльныя (патрэбы цела) і духоўныя (патрэбы душы). Парадаксальна, што гэты агульнавядомы факт часта забываецца нягледзячы на тое, што, будучы яшчэ, згодна Гегелю, дыялектычна супярэчлівым і таму рухомым і зменлівым, менавіта ён прадвызначае сабой усю спецыфіку і складанасць сістэмна-структурнага складу культуры і яе катэгарыяльна-паняційнага апарату і ў дыяхронна-гістарычным яго аспекце.

## Сутнасць феномену сацыякультурнай сістэмнасці

Апарат гэты, зрэшты, і да сённяшняга часу застаецца нераспрацаваным па той жа прычыне агульнага спаўзання ў будзённую прагматыку і эмпірызм разам з культурай і самой навукі аб культуры, у выніку чаго могуць узнікаць нават зусім ужо класічныя парадоксы кшталту расelаўскага цырульніка альбо антычнага крыцяніна-ілгуна.[8] Каб упэўніцца ў гэтым, варта параўнаць знакамітую *Философию хозяйства* Сяргея Булгакава[9] або *Основные проблемы экономической статики и динамики* Мікалая Кандрацьева[10] з некаторымі аналагічнымі тэкстамі сучасных эканамістаў, якія, гаворачы фігуральна, не бачаць за дрэвамі лесу (у рабоце Кандрацьева ёсць нават раздзел, спецыяльна прысвечаны асноўным эканамічным катэгорыям, якія так і называюцца, як у нас у Беларусі вылучаліся асноўныя эстэтычныя катэгорыі ў сферы эстэтыкі – гэтай своеасаблівай тэорыі мастацкай культуры, а пазней і ў галіне тэарэтычнай культуралогіі – катэгорыі культуралагічныя[11]). Не распрацоўваецца той апарат дастаткова хутка і таму, што дзейнічае яшчэ і азначаная боязь схематызму, якая тлумачыцца не толькі духам часу, г.зн. дыяхронна-гістарычнымі абставінамі, але і больш глыбіннымі сінхронна-структурнымі прычынамі, заключанымі ў самой будове культуры як вельмі вялікай шматузроўневай, іерархічнай структуры. Тлумачыцца не толькі яе складанасцю, але і тым, што культура, як і ўвогуле любы аб’ект сацыяльнай прыроды, прадстае ў нашым успрыняцці не як адзіны ў сваёй цэласнасці

8 Згодна Бертрану Раселу такі парадокс мог узнікнуць, напрыклад, у арміі, дзе цырульніку загадвалася галіць толькі тых, хто не можа галіцца сам. З ілгуном-крыцянінам у Зянона-элейца атрымлівалася тое самае, калі ён гаварыў: «Я ілгу».

9 Булгаков С.Н. *Философия хозяйства.* М., 1990.

10 Кондратьев Н.Д. *Основные проблемы экономической статики и динамики.* М., 1991.

11 Крукоўскі М.І. *Філасофія культуры (уводзіны ў тэарэтычную культуралогію).* Мінск, 2000. С. 39.

вельмі вялікі аб’ект, а як незлічонае іерархічнае мноства больш дробных паасобных узроўняў-аб’ектаў, адзінства і цэласнасць якога можа ўспрымацца і разумецца толькі ў сумарным статыстыка-верагоднасным, абагульненым розумам плане. Таму сувязі паміж аб’ектамі, што аб’ядноўваюць іх у адзінае вялікае цэлае, выступаюць не як непасрэдныя функцыянальныя залежнасці, якія могуць быць успрыняты непасрэдна і выражаны геаметрычнымі і матэматычнымі схемамі (у вышэйшай матэматыцы для гэтага і выкладаецца аналітычная геаметрыя), а толькі як залежнасці карэляцыйныя, што выражаюцца толькі статыстыка-верагоднасным спосабам, вынікі якога неспецыялістамі не могуць успрымацца непасрэдна-пачуццёва, а ўсялякія спробы выразіць іх абстрактна-графічным спосабам звычайна трактуюцца як недазвольны схематызм.

Гэткая складанасць культуры абумоўлівае сабою складанасць узаемасувязей, што ўтвараюць і арганізуюць адзінства і цэласнасць культуры як сістэмы. Узаемасувязі адрозніваюцца звычайна як сувязі субардынацыйныя і каардынацыйныя, г. зн. сувязі, што злучаюцца ў лагічнай прасторы па сінхроннай вертыкалі праз усе прамежкавыя іерархічныя ступені структуры і элементы, і сувязі, якія звязваюцца паміж сабою ў лагічным часе ўжо па дыяхроннай гарызанталі факты кожнай з усіх тых прамежкавых падструктурных ступеней. Дзякуючы гэтаму аказваюцца звязанымі паміж сабою субардынацыйна, так бы мовіць, па вертыкалі, хоць і не наўпрост функцыянальнымі, але ўскосна карэляцыйнымі залежнасцямі факты, напрыклад, мастацкай культуры з фактамі вышэйшых узроўняў культуры ўвогуле і з фактамі ніжэйшых узроўняў – выяўленчага мастацтва, а цераз тыя ў сваю чаргу і з фактамі жывапісу ці графікі і так да паасобных канкрэтных карцін або малюнкаў. Роўна як і каардынацыйна з’яўляюцца звязанымі такімі карэляцыямі ўжо па гарызанталі факты той жа мастацкай культуры, як літаратура, жывапіс, музыка, архітэктура і арнаментыка. Калі ўсе такія ўзаемасувязі ўсвядомлены хоць бы ў агульных рысах, адразу ж становіцца зразумелым прыведзенае вышэй не выпадковае супастаўленне фінансавага крызісу ў матэрыяльнай культуры з крызісам у постмадэрнісцкім жывапісе культуры мастацкай. Гэтак жа зразумелай становіцца і наіўная павярхоўнасць меркаванняў, што прычына абодвух крызісаў крыецца быццам бы толькі ў партыйнай прыналежнасці ці недастатковай падрыхтаванасці фінансістаў альбо ў пэўнай нацыянальнасці постмадэрнісцкіх мастакоў. Паколькі і той, і другі факт адносяцца да адной і той жа сістэмы, што ўтвараюць сабой культуру ўвогуле як цэласна-сістэмнае адзінства матэрыяльнай, мастацкай і духоўнай субкультур, то і ўзнікненне і развіццё іх абедзвюх залежыць ад структурных асаблівасцей вышэйшых ступеняў-узроўняў, у тым ліку і ступені агульнакультурнай. Гэта як калі б мы, вывучаючы асаблівасці надвор’я, улічвалі не толькі тэмпературу дадзенага моманту сутак, але б, выразна іх адасабляючы, і спецыфічныя ўласцівасці дзённай і начной тэмператур, і аналагічныя яшчэ больш

агульныя рысы тэмператур часоў года, і нават зусім ужо агульныя тэмпературныя асаблівасці цэлай геалагічнай эпохі, што рэальна заўсёды і робіцца. Прытым, чым больш высокі па іерархіі дадзены ўзровень, тым больш заканамерны характар маюць належныя яму асаблівасці і наадварот. Так скрозь хаатычную, здавалася б, складанасць культуры ў цэлым пачынае выразна праглядваць і яе дастаткова строга арганізаваная сістэмная структурнасць, а праславуты, так услаўлены сучаснай постмадэрнісцкай філасофіяй і навукай хаос паступова ператвараецца з нейкага злавесна таямнічага аб'ектыўнага фактара ў факт усяго толькі нашага суб'ектыўнага няведання і неразумення. З гэткай жа заканамернасцю ўзрастае для сучаснай апісальнай эмпірычнай культуралогіі і важнасць далейшага развіцця менавіта культуралогіі тэарэтычнай, важнасць для разумення сутнасці і ўзаемасувязі ў тым ліку і такіх канкрэтных фактаў і з'яў, як крызісы ў паасобных і, здавалася б, зусім не звязаных паміж сабою галінах культуры[12] і, зразумела ж, сённяшні фінансавы крызіс.

Тая ж надзвычай складаная, але лагічна дастаткова празрыстая структурная сетка субардынацыйных і каардынацыйных сувязей, што ўтвараюць сацыякультурную сістэмнасць, выразна перасякаецца і ўзаемаўзгадняецца ў кантэксце не толькі сінхроннаструктурнага, але і дыяхронна-функцыянальнага тэарэтыкасістэмнага яе аспекту. Альбо, іншымі словамі, не толькі ў вертыкальна-папярэчным яе разрэзе, але і ў гарызантальна-падоўжаным гістарычным зрэзе яе ўздоўж лагічнай каардынаты часу. У нашым выпадку апошні аспект і аказваецца для нас найбольш важным, бо паняцці крызісу ў тым ці іншым канкрэтным абліччы адносяцца да дыяхроннага гістарычнага сацыякультурнага аспекту, дзе асноўную ролю пачынаюць адыгрываць такія катэгорыі існавання і развіцця культуры ў часе, як станаўленне, росквіт, заняпад і распад, куды, уласна кажучы, і належыць паняцце крызісу, якое нас цікавіць.

Тут таксама неабходна ўлічваць усю гэтую вертыкальную іерархію аб'ектыўных прычын і суб'ектыўных мэтаў у працэсе гістарычнага бытавання і развіцця культуры як вельмі[13] вялікай складанай сістэмы. Улічваць на ўсім дыяпазоне яе структурных узроўняў, уключаючы самыя агульныя і шырокія, не абмяжоўваючыся як у нашым прыкладзе з крызісамі толькі памылкамі малападрыхтаваных эканамістаў ці нядобрымі намерамі некаторых мастакоў, а прымаючы ў разлік і агульнакультурныя, агульнасацыяльныя аб'ектыўныя прычыны і абставіны.

---

[12] Сёння ў сувязі з эканамічным крызісам, з далейшым абвастрэннем экалагічнай праблематыкі і, нарэшце, з паступовым нарастаннем катастроф у прыродным асяроддзі пачынаюць пашырацца пэўныя гаворкі пра ўсеагульны апакаліптычны крызіс чалавецтва ўвогуле як сістэмы, і ўсё гэтае таксама заслугоўвае найвастрэйшай увагі, але гэта ўжо тэма іншай размовы.

[13] Тут слова «вельмі» ўжываецца ў яго тэрміналагічным сэнсе як часткі ўжыванага У.Р. Эшбі спецыяльнага выразу «очень большая сложная система», гл.: Эшби У.Р. *Введение в кибернетику.* М., 1959.

Так, узгаданыя ўжо крызісы ў эканоміцы і мастацтве, безумоўна ўзаемазвязаны паміж сабой пэўным станам агульнакультурнага развіцця ўсяго грамадства і абумоўліваюцца фазаю заняпаду ў гэтым працэсе. Усе мы добра адчуваем тое інтуітыўна, але што гэта заняпад, не ўмеем яшчэ даказваць строга лагічна, як патрабуецца ў тэарэтычнай культуралогіі (некаторымі яго прадстаўнікамі сённяшні крызіс у мастацтве наадварот дагэтуль лічыцца суперпрагрэсіўным арыгінальным наватарствам![14]). Напрыклад, пэўныя пад'ёмы і спады ў гісторыі культуры эмпірычна заўважаліся ўжо даўно і інтуітыўна тлумачыліся як пэўная цыклічнасць яшчэ філосафамі еўрапейскай і ўсходняй далёкай старажытнасці. Але навуковага прызнання ў нас і ў Расіі яны дасягнулі толькі нядаўна з выхадам у свет вядомых манаграфій пра цыклічны характар сацыякультурнага развіцця[15], якія насілі, аднак, пераважна эмпірычны характар, асабліва ранейшыя з іх, перакладныя. Таму азначаныя пад'ёмы і спады ў працэсе развіцця эмпірычна ўспрымаліся як выпадковыя або ў лепшым варыянце здаваліся, як у Піцірыма Сарокіна[16], маятнікападобнымі хістаннямі з няяснай прычынай (Сарокін называў іх туманна «першымі прынцыпамі», сам беручы іх у двукоссе, «прынцыпамі іманентных змен сацыяльна-культурных сістэм» або часцей за ўсё проста акрэсліваў іх запазычаным з тэорыі верагоднасцей тэрмінам «флуктуацыі», нават часам мяняючы месцамі гэтыя фазы-флуктуацыі ў працэсе самога сацыякультурнага развіцця, што адразу ж пазбаўляла іх самага нязначага лагічнага сэнсу).

## Спецыфіка працэсу нестабільнага развіцця грамадства

Сёння, з пачаткам у Беларусі, а пазней і ў Расіі, распрацовак у галіне культуралогіі тэарэтычнай, гэты недахоп павінен быць выпраўлены і перш за ўсё, пачынаючы з устанаўлення іерархіі больш шырокіх і агульных прычын з'яў, якія прывялі да гэтага. Такія магчымасці забяспечваюцца агульнай тэорыяй сістэм, згодна з якой вельмі вялікія, у сэнсе Эшбі, сістэмы аказваюцца няўстойлівымі і заўсёды перажываюць рэгулярныя, падобныя да сінусоіды,

---

[14] Так пра скандальнавядомага расійскага пісьменніка Уладзіміра Сарокіна адна маскоўская слухачка радыё «СВАБОДА» сказала, што вельмі любіць яго з-за ягонай «предельной честности», якую на справе варта было б хутчэй азначыць як «предельный цинизм».

[15] Гл.: Яковец О.В. *История цивилизаций.* М., 1995; Абдеев Р.Ф. *Философия информационной цивилизации.* М., 1994; Пантин В.И. *Циклы и ритмы истории.* Рязань, 1996; *Цивилизация: восхождение и слом.* М., 2003; *Циклические ритмы в истории, культуре, искусстве.* М., 2004. Прыблізна ў тыя ж гады ў Маскве былі выдадзены і пераклады даўно ўжо вядомых на Захадзе аналагічных манаграфій Шпенглера, Тойнбі і Сарокіна. Аднак, яшчэ з сярэдзіны шасцідзесятых гадоў у Беларусі публікаваліся нашы эстэтычныя манаграфіі па той жа праблеме, але ўсе яны засталіся праігнараванымі як у Беларусі, так і ў Расіі (у апошняй яны нават былі злосна раскрытыкаваны).

[16] Сорокин П.А. *Социальная и культурная динамика.* М., 2006.

маятнікападобныя хістанні, ці, як іх называе О. Ланге[17], асцыляцыі, але ні ў якім разе не чыста выпадковыя хаатычныя флуктуацыі. Тыя самыя хістанні, што адзначаў і Норберт Вінэр[18], апісваючы іх як своеасаблівыя рысканні вялікай сістэмы. Гэтыя асцыляцыі-рысканні ўзнікаюць у вялікай сістэме ад таго, што ў ёй з-за шматузроўневай іерархічнай структуры заўсёды цяжка ўстанаўліваецца, а то і не ўстанаўліваецца зусім, стан устойлівай раўнавагі паміж прамымі і адваротнымі сувязямі сістэмы, стан, які называецца ў тэорыі сістэм і ў кібернетыцы гамеастазісам. Тое адбываецца менавіта з-за іерархічнай шматузроўневай структуры вельмі вялікай сістэмы, калі пры ўзаемадзеянні прамых і адваротных сувязей паміж прамымі дзеяннямі вышэйшых структурных узроўняў заўсёды павінен прайсці пэўны час, каб тыя дзеянні маглі назапасіцца і магло распачацца адваротнае сумарнае дзеянне ўзроўняў ніжэйшых, элементных на ўзроўні вышэйшыя, структурныя. І наадварот. Час гэты і Вінэр, і Эшбі[19] называлі мёртвым часам і менавіта таму пікі ўзаемадзеяння прамых і адваротных сувязяў у сістэме не супадаюць, прымушаючы яе перажываць тую самую сінусоіду ў працэсе свайго развіцця. Усё гэта надзвычай наглядна рэалізуецца ў сінусаідальнай цыклічнасці працэсу сацыяльнага развіцця грамадства, калі з-за запазнення і назапашвання рэакцыі сацыяльных нізоў на пастановы і распараджэнні кіруючых сацыяльных структур; і наадварот, узнікае не толькі пэўная сацыяльная няўстойлівасць і нестабільнасць, а магчымы нават сацыяльны выбух тыпу рэвалюцыі. Славутае ў свой час марксава ўзаемадзеянне вытворчых адносін і прадукцыйных сіл якраз і меркавалася такім, што ішло па гэтай лагічнай траекторыі. Яшчэ выразней тое ўсё назіраецца ў гісторыі культуры ў працэсе ўзаемадзеяння яе духоўнай і матэрыяльнай субкультур.

З чалавецтвам як вельмі вялікай сістэмай не цяжка ўстанавіць і яшчэ больш агульныя прычыны нестабільнасці, якая таксама заўважалася філосафамі і навукоўцамі, пачынаючы ледзьве не з часоў грэхападзення і канчаючы амаль што сённяшнім Дэсмандам Морысам з яго голай малпаю і людскім звярынцам.[20] Тая ж нестабільнасць, як мы не раз ужо пісалі, яшчэ вастрэй адчувалася паэтамі і мастакамі ў іх пакутлівым і нярэдка дарэмным пошуку эстэтычнай гармоніі[21] і вечным імкненні «спыніць прыгожае

---

17 Ланге О. Целое и развитие в свете кибернетики // *Исследования по общей теории систем.* М., 1969. С. 181.

18 Винер Н. *Кибернетика, или Управление и связь в животном и машине.* М., 1968.

19 Эшби У.Р. *Введение в кибернетику.* М., 1959. (Такое запозненне з выкарыстаннем азначанага тыпу літаратуры таксама тлумачыцца тым жа мёртвым часам!)

20 Моррис Д. *Голая обезьяна.* СПб., 2001; Моррис Д. *Людской зверинец.* СПб., 2004.

21 Такім пошукам шчыра пакутваў некалі і аўтар гэтых радкоў (гл.: Крюковский Н.И. *Homo pulcher – человек прекрасный.* Мн., 1983), хоць і тады ўжо хацелася часам узяць гэты прэтэнцыёзны загаловак азначанай манаграфіі ў сумнеўныя пытальнікі на іспанскі манер з двух бакоў.

імгненне», з такою сілаю выражанае словамі Фауста ў вялікага Гётэ: *verweile doch, du bist so schön!* Сапраўды, вельмі цяжка спалучаюцца як у паасобным чалавеку душа і цела, так і ва ўсім грамадстве і культуры духоўнае і матэрыяльнае, грамадскае і асабістае. Бачылі тое, як ужо гаварылася, і мудрацы старажытнасці, і сярэднявечныя багасловы, якія абвінавачвалі чалавека ў грахоўнай сапсаванасці, і філосафы, і навукоўцы Новага часу, што лічылі чалавека памылкай эвалюцыі, а то і зусім голаю малпаю. Былі і такія, як напрыклад, Дж. Віка, Гегель і той жа Сарокін, што заўважалі ў гэтай ягонай нестабільнасці і памянёную сінусаідальнасць, хоць і не маглі растлумачыць сабе ісціннай яе прычыны.

Гэта стала магчымым толькі са з'яўленнем у навуковай тэорыі і практыцы тэарэтыка-сістэмнай метадалогіі, і то толькі ледзь не праз паўстагоддзя пасля яе адкрыцця.[22] Пэўным знешнім штуршком для гэтага паслужыла абвастрэнне экалагічнай праблематыкі ў сувязі не толькі з некантралюемым развіццём прамысловасці, але з некаторымі новымі сучаснымі з'явамі ў развіцці самой прыроды і ў першую чаргу з нечакана рэзкімі хістаннямі кліматычных умоў у акаляючым прыродным асяроддзі. У святле гэтай праблематыкі па-новаму стала сёння бачыцца і даўнішняя праблема паходжання чалавека. Тая праблема, як вядома, яшчэ з дарвінаўскіх часоў вырашалася пераважна з эвалюцыйнага пункту гледжання, і прыродныя ўмовы таго часу, умовы перыяду чацвярцічнага абледзянення, насіўшыя тады таксама яшчэ больш катастрафічны характар, улічваліся толькі як пэўны пасіўны геолага-храналагічны факт, толькі як знешнія фонавыя акалічнасці гэтай плаўнай, спакойнай, колькаснай эвалюцыі[23]. Гэтая супярэчнасць, трэба прызнаць, вельмі непакоіла і самога Дарвіна разам з Уолесам, а менавіта тым, што падобнай эвалюцыяй не вельмі тлумачыўся скачкападобны якасны па сваёй сутнасці працэс узнікнення чалавека як мыслячай, сацыяльнай істоты. Істоты, тым болей, востра супярэчлівай па сваёй прыродзе і як бы толькі пераходнай паміж жывёльнай і сацыяльнай часткамі Сусвету, што яшчэ Арыстоцелю дало мажлівасць азначыць і самога чалавека як *zoon politikon* – жывёлу сацыяльную, што абумовіла пэўную нестабільнасць усёй наступнай гісторыі і яго самога з ягонай культурай.

## Асцыляцыйны характар сацыякультурнай дынамікі

Сапраўды, змены, што ў часы чацвярцічнага абледзянення адбываліся з прыродным асяроддзем, у якім існавалі і развіваліся гамініды і сярод іх продкі чалавека, былі настолькі катастрафічныя[24], што значная частка расліннага і жывёльнага

---

22 Гэта таксама з прычыны ўсё той жа сінусаідальнасці лініі сацыякультурнага развіцця і сучаснага агульнакультурнага крызісу!

23 Pfeifer J.E. *The emergence of man.* London, 1972. Дубинин Н.П. *Что такое человек.* М., 1083.

24 Гл.: *Природа и древний человек.* М., 1981.

свету, якая не змагла прыстасавацца да новых умоў існавання ў ледавіковы перыяд, загінула, частка перасялілася ў больш спрыяльныя прыродныя рэгіёны, частка змушана была неяк прыстасавацца. Продкі чалавека як адносна найбольш высокаразвіты від ні анатамічна, ні фізіялагічна прыстасавацца ўжо не маглі. Адзінае, што яны былі ў стане зрабіць, каб выжыць, гэта карэнным чынам змяніць сістэму сваіх паводзін, замяніўшы ў ёй традыцыйную заснаваную на біялагічных інстынктах бязлітасную дарвінаўскую барацьбу за існаванне на сацыяльную ўзаемадапамогу ўнутры віду і паклаўшы ў аснову сваіх паводзін замест ваяўнічых інстынктаў розум з яго строгімі маральнымі патрабаваннямі. Інстынкты засталіся толькі ў сферы працэсаў харчавання і размнажэння як самых глыбінных і неабходных фактараў біялагічнага існавання. Усе ж астатнія ўзроўні сістэмы паводзін набылі сацыяльны характар, утварыўшы спецыфічную надбудову над імі ў форме складанай іерархічнай сістэмы сацыяльных норм і значна абмежаваўшы, а то і заблакіраваўшы ў ёй ролю інстынктаў. Блакіроўка і абмежаванне асабліва выразна адбіліся, напрыклад, на інстынктах размнажэння і харчавання (у харчаванні гэта была, хутчэй, строгая рэгуліроўка), што характэрна адлюстравалася і ў рэлігійных запаведзях, большасць якіх пачынаюцца грозным папярэджаннем з вельмі характэрнаю адмоўнаю часціцаю «не»[25]: не забі, не крадзі, не распуснічай, не хлусі, не падманвай і г. д., гэта значыць не рабі, як раней, і не будзь жывёлай[26]. Так ўзнік вядомы нам homo sapiens – чалавек разумны, так узнікла і чалавецтва як ужо знаёмая нам эшбіева вельмі вялікая сістэма. Пры гэтым зноў неяк забылі, што і сам чалавек, і чалавецтва – разумныя ўсё-такі толькі напалову. Другую палову складаюць інстынкты, і ўзаемнае проціборства ў сабе гэтых частак мы штодзённа і штохвілінна пакутліва адчуваем у сваім жыцці як нейкую ўнутраную раздвоенасць, як пэўную справядліва адзначаную рэлігіяй уласную грахоўнасць.[27]

Усё тое адбілася адпаведным чынам і на створанай чалавекам культуры як сістэме неабходных яму і адпаведных яго патрэбам каштоўнасцей. Каштоўнасцей матэрыяльных, што задавальняюць вельмі важныя цялесныя патрэбы чалавека, і каштоўнасцей

---

25 На часціцу «не» ў рэлігійных запаведзях не вельмі, здаецца, звярталі ўвагу даследчыкі гісторыі рэлігіі.

26 На тое, што такія прынцыпова важныя палажэнні, як запаведзі, пачынаюцца менавіта з адмоўя, а не са сцвярджальных форм, як рэкамендацыі, дагэтуль не звярталася ўвагі, ды і ўвогуле сёння вострую цікавасць выклікае рэальнае паходжанне саміх гэтых запаведзей, бо ні нядаўні наш груба зласлівы атэізм, ні сучасная наіўна эмацыянальная вера, якая грунтуецца толькі на прыгожай міфалогіі, не могуць задаволіць сваімі тлумачэннямі сучасную навуку, няхай мне даруюць шчырыя вернікі..

27 Усё гэта некалі было падрабязна, наколькі дазваляла цэнзура і жорстка навязваны тады афіцыйны аптымізм, разгледжана намі раней, хоць і засталося, на жаль, праігнараваным нашымі чытачамі; гл.: Крюковский Н.И. *Homo sapiens – человек прекрасный.* Мн., 1983.

духоўных, што задавальняюць гэтак жа неабходныя патрэбы душы. Сістэма гэта таксама з'яўляецца вельмі вялікай у сэнсе Эшбі. Таму сам, будучы ўнутрана супярэчлівым біясацыяльным адзінствам, чалавек і сваю культуру стварыў як такое ж востра супярэчлівае (Гегель, як мы памятаем, называў яго дыялектычным) адзінства матэрыяльнай і духоўнай субкультур, аб'яднаных культурай мастацкай, што пакутліва імкнулася аб'яднаць іх у сваім адвечным пошуку гармоніі і прыгажосці. У культуры і асабліва ў яе гісторыі гэтак жа выразна праявілася вінераўскае рысканне вельмі вялікай сістэмы, якое і надало ёй маятнікападобную хаду развіцця, якое некалі ў Беларусі параўноўвалася з вядомай ужо сінусоідай. Тыя культурна-гістарычныя ваганні ці асцыляцыі адбываліся з прычыны вышэй узгаданага запазнення ў назапашванні прамых і адваротных сувязей у іерархічнай шматузроўневай структуры сацыякультурнай сістэмы і ўзнікненні паміж іхнім дзеяннем таго мёртвага часу, што падзяляў сабою пікавыя моманты гамеастазісу, спараджаючы іх несупадзенні і надаючы ўсёй траекторыі сацыякультурнага развіцця сінусаідальны цыклічны характар. Паасобныя ж цыклы гэтага развіцця ў сваю чаргу абумоўлівалі ўзнікненне паасобных канкрэтных сацыякультурных утварэнняў, якія ўжо Данілеўскі называў у свой час культурна-гістарычнымі тыпамі, Шпенглер і Тойнбі – цывілізацыямі[28], а Сарокін – культурамі. Сюды ж адносіліся і грамадска-эканамічныя фармацыі Маркса, бо і яны ў сваёй аснове мелі гэткае ж асцыляцыйнае цыклічнае ў форме прамых і адваротных сувязяў узаемадзеянне паміж вытворчымі адносінамі і прадукцыйнымі сіламі, хоць яго лагічны механізм так і застаўся да канца нераспрацаваным.[29] Кожнае з гэтых утварэнняў, будзь то культура ці цывілізацыя, мелі перыяды ўласнага развіцця з іх заканамернымі фазамі станаўлення, росквіту, упадку і канчатковага знікнення, а кожная з гэтых фаз вылучалася ў сваю чаргу спецыфічнымі рысамі[30], што ў мастацкай культуры аб'ядноўваліся

---

28 Шпенглер, зрэшты, ужываў і тэрмін «культура», прыпісваючы толькі іншы сэнс: культурай называлася ў яго толькі культура на фазе росквіту, цывілізацыяй жа ён называў культуру, што прыходзіць у фазу заняпаду і з арганізму, як ён пісаў, ператвараецца ў механізм.

29 З гэтым фактам нам прыйшлося сутыкнуцца, калі вялася праца над канцэпцыяй цыклічнага развіцця мастацкай культуры ў манаграфіі *Логіка прыгажосці* (гл.: Крюковский Н.И. *Логика красоты.* Мн., 1965), дзе тыя марксавы палажэнні шырока выкарыстоўваліся намі і з цэнзурных меркаванняў, і з таго, што ў іх выразна прасвечвала дыялектычная логіка самога Гегеля. (Некаторыя рэцэнзенты кнігі на гэтай аснове тады нават наіўна папракалі аўтара ў вульгарным сацыялагізме!)

30 У беларускай эстэтыцы як своеасаблівай тэорыі мастацкай культуры гэтае ўзаемадзеянне было падрабязна тэарэтычна прааналізавана ў якасці лагічнай базы сістэмы асноўных эстэтычных катэгорый, устаноўлена іх прынцыповая сувязь з сістэмай мастацкіх стыляў не толькі ў культуры, але і адносна эстэтычнай тыпалогіі самога чалавека. Яна заслужана можа ганарыцца тым, што ў толькі дазволеных цэнзураю межах прадбачыла сённяшні крызіс; гл.: Крюковский Н.И. *Логика красоты.* Мн., 1965; *Основные эстетические категории (опыт систе-*

пад назвай мастацкага стылю, а культуролагі Шпенглер, Крэбер і эканаміст Тоні ўжывалі тэрмін «стыль» і ў агульным сацыякультурным яго значэнні.

### Узаемазалежнасць сацыяльных крызісаў

Як няцяжка здагадацца, да адной з такіх фаз безумоўна адносіцца і сённяшні эканамічны крызіс як фаза агульнага сацыякультурнага крызісу. Згодна з цыклічнай канцэпцыяй развіцця культуры такі агульны сацыяльны крызіс распачынаецца з парушэння ў чалавеку ўвогуле раўнавагі паміж сацыяльным і біялагічным (узгадаем Арыстоцеля!), грамадскім і індывідуальным, і станаўлення перавагі біялагічнага і індывідуальнага. З далейшым пераходам таго парушэння і на культуру з асноўнымі яе складнікамі – духоўнай і матэрыяльнай субкультурамі, парушэнне адноснай раўнавагі адбываецца таксама на карысць субкультуры матэрыяльнай. Калі эпохай такой адноснай раўнавагі-гамеастазісу, напрыклад, у агульнаеўрапейскім грамадстве і яго культуры лічыць вядомае Адраджэнне, – а так яно фактычна і было, – то ўжо з пачатку часоў Асветніцтва VIII стагоддзя з яго рэзкім канфліктам з рэлігіяй і культам матэрыялізму, як вядома, і пачынаецца агульны заняпад еўрапейскай духоўнасці з пераносам цэнтру цяжару на культуру матэрыяльную і працэсам бурнага развіцця яе пасля англійскага прамысловага перавароту. Цераз сістэму каардынацыйных сувязяў усё гэта выразна назіраецца ў развіцці духоўнай і мастацкай субкультур, як напрыклад, выхад на першы план філасофскага матэрыялізму ў першай, і мастацкага натуралізму – у другой. Або ў палітэканоміі гэтага перыяду ўстаноўка на індывідуалістычны характар рынкавай гаспадаркі з яго залішне даверлівай пазітыўнай ацэнкай стыхіі рынку (згодна з Адамам Смітам рынкавая стыхія павінна ўпарадкоўвацца «нябачнай боскай рукой») і агульнай устаноўкай не на вытворчасць, а на спажыванне. Праз сістэму субардынацыйных сувязяў матэрыяльная культура ў гэты перыяд перажывае свой росквіт пад назвай тэхнічнай рэвалюцыі XIX–XX стагоддзяў, дзе выразна бачыцца і падсінусоіда яе ўласнага развіцця[31] з перавагай у пачатку, як паказаў Макс Вебер, этычнага прынцыпу і рацыянальнай карысці (вытворчая праца як аснова вартасці ў класічнай палітэканоміі Сміта–Рыкарда–Маркса), а затым таксама пераходам у стан эканомікі ўжо не вытворчай, а спажывецкай, адпаведна з панаваннем прынцыпу не рацыянальна ўсвядомленай карысці, а пераважна пачуццёвай

*матизации).* Мн., 1974; *Кибернетика и законы красоты (философский анализ).* Мн., 1977; *Homo pulcher – человек прекрасный.* Мн., 1983.

31 Маецца на ўвазе працэс развіцця матэрыяльнай культуры на сваім уласным узроўні як адносна самастойнай часткі сістэмы культуры ўвогуле (гэту розніцу паміж цыкламі развіцця агульнай культуры і іерархічна ніжэйшых за яе адносна самастойных субкультур заўважаў і Сарокін, называючы фазы агульнакультурнага развіцця суперцыкламі, але гэтае паняцце засталося ў яго ў выглядзе намёку амаль не развітым).

асалоды[32] (Бентам–Міль), што і назіралася да апошняга часу і з чаго можа адлічвацца пачатак сённяшняга эканамічнага крызісу (узгадаем бессаромна шыкоўныя яхты Абрамовіча і скандальныя прыгоды іншых расійскіх алігархаў у Куршавэлі). Пачатак гэты прадвызначаецца і ў плане агульнакультурнага развіцця, згодна чаму матэрыяльная культура як істотная частка цэласнай сістэмы культуры цалкам самастойна развівацца ex definitione не можа, асабліва ва ўмовах такога глыбокага крызісу і заняпаду ў культуры духоўнай.

Так з поўнай заканамернасцю на нас навальваецца нечаканы і, здавалася б, глыбокі эканамічны крызіс. Крызіс, зрэшты, не толькі эканамічны (матэрыяльна-культурны), але і агульнакультурны, крызіс, так бы мовіць, падвойны. Прычыны таго крызісу могуць быць добра праілюстраваны хоць і спрошчаным, але выразным параўнаннем яго з таксама амаль што перманентным крызісам колішняй савецкай эканомікі, крызісам, які меў, аднак, дыяметральна супрацьлеглы характар. Савецкая эканоміка пастаянна хварэла, як вядома, ад абсалютызацыі планава-вытворчага характару і занядбанасці спажывання, з-за чаго дзяржава ўвесь час змушана была звяртацца да сваіх грамадзян з патрабаваннем бясконцых пазык (старэйшае пакаленне выдатна памятае «подписки на заём»), якія, аднак, яна ніколі не магла пагасіць, што адпаведна вельмі адмоўна адбівалася на спажыванні і на якасці выробленых такім спосабам спажывецкіх тавараў. Грошы, як кажуць, у кішэні былі, але за іх не было што купіць. Эканоміка ж заходняя, экстрэмальна арыентаваная на спажыванне, дзеля задавальнення гэтага спажывання бясконца праз банкавую сістэму крэдытавала сваіх грамадзян, якія з-за агульнага маральна-духоўнага заняпаду грамадства, скіраванага на сталае спажыванне, таксама не хацелі ці не маглі вярнуць тыя крэдыты, што выразней за ўсё бачна ў амерыканскім крызісе іпатэчнага крэдытавання. У выніку з'явілася перавытворчасць тавараў, але зніклі грошы. За дастаткова вялікі знаёмы нам вінераўскі «мёртвы час» назапасілася шмат адваротных сувязей, і ў выніку грымнуў крызіс. Крызіс, які мы сёння і маем няшчасце перажываць, і які прадбачыўся асноўнымі сусветнымі рэлігіямі, якія заўсёды лічылі ліхвярства – гэтую сучасную форму фінансавага капіталу, – грахом і ацэньвалі яго вельмі адмоўна.

Нечаканасць жа гэтага крызісу, як няцяжка здагадацца, абумоўліваецца пераважна суб'ектыўным фактарам, а, менавіта, слабой распрацаванасцю філасофіі культуры і на яе базе тэарэтычнай культуралогіі, якой павінны кіравацца эканамісты і агульнадзяржаўная ўлада, а не бессэнсоўна заглыбляцца ў эмпірычны хаос вузкаканкрэтных эканамічных дробязяў, нагадваючы нам колішняе папярэджанне матэматыка Пуанкарэ не вывучаць слана з дапамогай мікраскопа. Гэтая нераспрацаванасць тэ-

[32] Тут якраз і дапаможа прапанаваная намі логіка аб'ектыўных і суб'ектыўных каштоўнасных катэгорый, гл.: Крукоўскі М.І. *Філасофія культуры (уводзіны ў тэарэтычную культуралогію).* Мінск, 2000. С. 39.

арэтычнай культуралогіі, зрэшты, аб'ектыўна бачна пры напісанні і гэтага артыкула, калі пры разглядзе праблемы крызісу з дапамогай складаных субардынацыйных і каардынацыйных сувязей паміж структурамі, падструктурамі і элементамі такой звышскладанай сістэмы, як культура ў цэлым, выразна адчувалася недастатковасць існуючай культуразнаўчай эмпірыкі і неабходнасць прыстасоўвання не толькі логікі, але і прафесійнай матэматыкі з яе тэорыяй радоў Фур'е, алгебрай структур і іншымі яе праверанымі навукай магутнымі даследчымі сродкамі.

Адыграла тут сваю нядобрую ролю і тое, што развіццё культуралогіі – і менавіта культуралогіі тэарэтычнай – абмяжоўвалася пастаяннай арыентацыяй на аднабаковасць матэрыялістычнай філасофіі, што ў сваю чаргу тлумачыцца парадаксальным уплывам гісторыі культуры на саму сябе, г.зн. спецыфікай яе ўласнага развіцця.[33] Эканоміка таму ставілася (і ставілася не адным толькі марксізмам!) у аснову ўсяго сацыякультурнага працэсу і міжвольна пачынала хварэць, па выразу С. Булгакава, на мегаламанію, прэтэндуючы на абсалютную навуковую самастойнасць. Таму нават такі высокаадукаваны спецыяліст, як Маркс, не мог заўважыць, што змест паняцця вартасці ўключае ў сябе не толькі фізічную энергію чалавека як матэрыяльнага фактара, але і як фактар ідэальны – дзейнасць яго свядомасці, сёння вядомай пад назвай інфармацыі, гэтай асновы духоўнай культуры (у выніку у краінах былога СССР дагэтуль разумовая праца ацэньваецца вельмі нізка і зарплата ўніверсітэцкага прафесара раўняецца зарплаце кіроўцы тралейбуса). Зрэшты, паняцце інфармацыі ўсё з той жа прычыны толькі адносна нядаўна стала ўвогуле вядомым, і, напрыклад, нават сучасная фізіка, як мы некалі пісалі[34], яшчэ і сёння не ўключае яго ў склад сваіх катэгорый. Гэта, аднак, ужо тэма іншай размовы.

* * *

У самім выразе «агульны крызіс» нічога нечакана новага, па сутнасці, няма, бо ўжо амаль што з другой паловы XIX стагоддзя пра гэты крызіс шмат гаварылася і ў філасофіі, і ў мастацтвазнаўстве, і ў эканоміцы, з той толькі, можа, розніцай, што ў апошняй, К. Маркс у цэлым правільна ацэньваючы сутнасць крызісу, акрэсліваў яго занадта вузка, абмяжоўваючы гэты крызіс пераважна межамі капіталізму. І вось толькі сёння нашы палітолагі раптам заўважылі, што ён мае і ўсеагульны характар, спазненне, якое само можа не без парадаксальнасці тлумачыцца толькі тым самым агульным крызісам. Бо з-за яго менавіта ў нас сёння і існуе такі крызісны, скажам так, «стыль» не ў адной толькі эканоміцы, а і ў культуры яе цалкам, так

[33] Гэта, як ужо адзначалася, парадокс кшталту цырульніка Бертрана Расела або антычнага крыцяніна-ілгуна.

[34] Крукоўскі М.І. *Філасофія культуры (уводзіны ў тэарэтычную культуралогію).* Мінск, 2000. С. 60–61.

і ў паасобных яе разнавіднасцях, як філасофія, мастацтва, мараль і той жа, напрыклад, жывапіс. З-за яго не развівалася і тэарэтычная культуралогія, якая дала б нам магчымасць заўважыць усё гэта нашмат раней і даць сапраўды не толькі тэарэтычнае тлумачэнне прычын крызісу, але і пэўныя практычныя рэкамендацыі ўладам па спосабах процістаяння ва ўмовах такой смутнай агульнай сацыякультурнай рэчаіснасці.